# З ЛЮБОЎЮ І ЎДЗЯЧНАСЦЮ

***Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Ганаровы прафесар ВДУ імя П.М. Машэрава, выпускнік мастацка-графічнага факультэта Уладзімір Пракапцоў – часты госць нашага ўніверсітэта. Прыехаў Уладзімір Іванавіч і на святкаванне 110-гадовага юбілею альма-матэр. Ды і не з пустымі рукамі, а з выставай «Майму Віцебску, маёй Alma mater», прысвечанай выкладчыкам і выпускнікам мастацка-графічнага факультэта розных гадоў.***



У экспазіцыі – жывапісныя работы Уладзіміра Пракапцова, большасць з якіх захоўваецца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея. На карцінах паказаны родная вёска, харастово беларускай прыроды, Віцебск. Ёсць і студэнцкая, напісаная на трэцім курсе работа, якую захавала маці мастака.

Як адзначыў на ўрачыстым адкрыцці мастацтвазнаўца, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва Міхась Цыбульскі, выстава ў нашым універсітэце – частка цыкла выстаў, якія Уладзімір Пракапцоў арганізуе па ўсёй рэспубліцы. Да гэтага жыхары і госці Лепеля маглі паглядзець экспазіцыю «Мая Беларусь». На чарзе – Полацк.

«Маё сэрца належыць Беларусі, – прызнаўся Уладзімір Іванавіч. – А Віцебск – горад майго студэнцтва. Я хвалююся кожны раз, калі прыязджаю сюды. Такое адчуванне, што вяртаюся ў маладосць. Я бясконца ўдзячны маім педагогам за тое, што яны вучылі нас не толькі мастацтву, але і прывілі агульначалавечыя якасці.

Памятаю, як мы працавалі вечарамі, начамі, у выхадныя... Нас выганялі дадому, у інтэрнат, а мы не пагаджаліся, бо ўсе марылі стаць Маркам Шагалам... А інакш было і немагчыма, бо мы жылі ў Віцебску – горадзе з атмасферай мастацтва».

На мерапрыемстве ў адрас Уладзіміра Іванавіча прагучала шмат добрых слоў ад рэктара ўніверсітэта Валянціны Багатыровай, а таксама ад ганаровых гасцей – старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыяльнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктара Лісковіча і старшыні рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Белая Русь» Генадзя Давыдзькі.

«Дзякуй вам за любоў да мастацтва і да людзей, а галоўнае – за любоў да сваёй альма-матэр. Уладзімір Пракапцоў – гонар нашага ўніверсітэта», – адзначыла Валянціна Багатырова.

Таксама Валянціна Васільеўна ўручыла пахвальны ліст ВДУ імя П.М. Машэрава маладому скульптару Рыпсімэ Геваркян, якая зрабіла падарунак музею мастацка-графічнага факультэта – бронзавы бюст – партрэт Уладзіміра Пракапцова.

«Я жадаю, каб выпускнікі заўсёды памяталі сваю альма-матэр і былі ўдзячныя настаўнікам, якія з'яўляюцца іх другімі бацькамі, за тое, што тыя дапамаглі ім выйсці на вялікую дарогу жыцця», – падагульніў Уладзімір Пракапцоў.

**Тэкст і фота Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**

*Відэарэпартаж з адкрыцця выставы можна паглядзець з дапамогай Qr-кода.*

# КАБ ГАНАРЫЛІСЯ І ПОМНІЛІ

***13 мая на вуліцы Чэхава, 11 (вучэбны корпус №2) адбылося адкрыццё памятнай дошкі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава (аўтар – Сяргей Сотнікаў, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва).***

Па словах Міхаіла Цыбульскага, дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта, гэтае знакавае мерапрыемства, якое адбываецца ў дні святкавання 110-годдзя ВДУ імя П.М. Машэрава, ставіць першую кропку ў вызначэнні ролі Віцебскай мастацкай школы другой паловы XX стагоддзя. Мемарыяльная дошка прысвечана выкладчыкам і выпускнікам Віцебскага мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча, а таксама мастацка-графічнага факультэта, якія ў свой час працавалі ў гэтым будынку. Тут вучыліся тыя мастакі, якія сёння з'яўляюцца гонарам Віцебскай мастацкай школы.

Намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта Віктар Глушын адзначыў: «Прыемна, што ў нашым горадзе шануецца памяць аб Віцебскай мастацкай школе. Тут былі і ёсць мастакі, якімі мы ганарымся. І вельмі добра, што ў дні святкавання 110-годдзя ўніверсітэта адкрываецца такая лаканічная і творчая дошка, якая будзе нагадваць пра тое, што ў гэтым прыгожым будынку размяшчаліся дзве ўстановы, што заклалі падмурак мастацкай школы другой паловы XX стагоддзя».